КОНТРОЛЬНЫЙ ЭКЗЕМПЛЯР

Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка»

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар па вучэбнай рабоце
__________ А.В. Макоўчык
«25» 06. 2020 г.
Рэгістрацыйны № УД-31-2/27/2021 вуч.

# ТЭОРЫЯ ЛІТАРАТУРЫ

**Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі**
**па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасцей**
**1-02 03 01 Беларуская мова і літаратура;**
**1-02 03 03 Беларуская мова і літаратура. Замежная мова**
**(з указаннем мовы)**

2020 г.

Сканировано с CamScanner

Вучэбная праграма складзена на аснове тыпавой вучэбнай праграмы «Тэорыя літаратуры», зацверджанай 04.02.2015, рэгістрацыйны нумар ТД-А.55/тып. і вучэбных планаў для спецыяльнасцей 1-02 03 01 Беларуская мова і літаратура;
1-02 03 03 Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (з указаннем мовы)


**СКЛАДАЛЬНІК:**
А.І. Лугоўскі, дацэнт кафедры беларускай і замежнай літаратуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», кандыдат педагагічных навук, дацэнт


**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
Д.В. Дзятко, загадчык кафедры мовазнаўства і лінгвадыдактыкі ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка", кандыдат філалагічных навук, дацэнт;
І.Д. Воюш, дацэнт кафедры медыялогіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат філалагічных навук, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
Кафедрай беларускай і замежнай літаратуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»
(пратакол № 12 ад 26.05. 2020 г.)

Загадчык кафедры
_____________ І.М. Мішчанчук

Дэкан філалагічнага факультэта
_____________ В.Д. Старычонак

Навукова-метадычным саветам установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»
(пратакол № 5 ад 16.06. 2020 г.)

Дырэктар бібліятэкі БДПУ_____________Н.П. Сяткоўская

Афармленне вучэбнай праграмы і суправаджаючых
яе матэрыялаў дзеючым патрабаванням Міністэрства
адукацыі Рэспублікі Беларусь адпавядае

Метадыст вучэбна-метадычнага
аддзела БДПУ
_____________ С.Н. Смарадуб
(подпіс) (ініцыялы, прозвішча)


Сканировано с CamScanner

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна «Тэорыя літаратуры» працягвае і завяршае навучанне па адной з базавых дысцыплін, па якіх вядзецца падрыхтоўка спецыялістаў-філолагаў у вышэйшай педагагічнай установе, – літаратуразнаўству. Яна знаёміць з найбольш агульнымі заканамернасцямі развіцця мастацтва слова: раскрывае змест асноўных эстэтычных і ўласна літаратурных катэгорый і паняццяў, неабходных для аналізу літаратурна-мастацкіх з'яў, характарызуе канцэпцыі і тэорыі сутнасці мастацкай творчасці, паказвае суадносіны літаратуры з рэчаіснасцю, выяўляе законы мастацкай творчасці, што служыць больш поўнаму раскрыццю і асэнсаванню мастацкага свету твора і творцы. Аб'ектам вывучэння дысцыпліны «Тэорыя літаратуры» выступаюць сусветны літаратурны працэс і яго складнікі – літаратуры нацыянальныя, агульная і гістарычная паэтыка, літаратурныя роды і жанры ў іх гістарычнай эвалюцыі.

***Мэта*** вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Тэорыя літаратуры»: вывучэнне станаўлення і развіцця літаратуразнаўства; усведамленне найбольш значных пытанняў у аргранізацыі мастацкага твора і літаратурнага працэсу, а таксама авалоданне прынцыпамі і навыкамі аналізу твора ў яго мастацкай цэласнасці.

***Задачы вучэбнай дысцыпліны*:**

– выпрацаваць крытэрыі разумення канкрэтна-гістарычнай, нацыянальнай і агульначалавечай значнасці мастацкіх твораў;
– даць рознабаковыя веды па прадмеце, навучыць арыентавацца ў свеце мастацкіх эпох, стыляў, метадаў, напрамкаў.
– сістэматызаваць уяўленні студэнтаў пра эвалюцыю мастацкай думкі чалавецтва, пра станаўленне і шляхі развіцця літаратурных родаў, жанраў, жанравых форм;
– пазнаёміць з асноўнымі літаратуразнаўчымі метадамі, з сістэмай навуковых і крытычных жанраў;
– раскрыць сутнасць і ролю тэарэтычных ведаў пры вывучэнні літаратурных твораў розных гістарычна-мастацкай эпох;
– выхоўваць эстэтычны густ, адчуванне прыгожага ў жыцці і літаратуры.

*Месца вучэбнай дысцыпліны ў сістэме падрыхтоўкі спецыяліста, сувязі з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі.* Згодна тыпавому вучэбнаму плану па спецыяльнасці 1–02 03 01 «Беларуская мова і літаратура» вучэбная дысцыпліна «Тэорыя літаратуры» ўваходзіць у дзяржаўны кампанент. Згодна тыпавому вучэбнаму плану па спецыяльнасці 1-02 03 03 «Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (з указаннем мовы)» вучэбная дысцыпліна «Тэорыя літаратуры» ўваходзіць у кампанент вышэйшай адукацыі.

Вучэбная дысцыпліна «Тэорыя літаратуры» звязана з вучэбнымі дысцыплінамі «Уводзіны ў літаратуразнаўства», «Гісторыя беларускай

літаратуры», «Сусветны літаратурны працэс», «Методыка выкладання беларускай літаратуры».

*Патрабаванні да засваення вучэбнай дысцыпліны.* Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Тэорыя літаратуры» павінна забяспечыць фарміраванне ў студэнтаў акадэмічных, сацыяльна-асобасных, прафесійных кампетэнцый.

*Патрабаванні да акадэмічных кампетэнцый*

Студэнт павінен:

АК-1. Умець прымяняць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных задач.

АК-2. Валодаць сістэмным і параўнальным аналізам.

АК-3 Валадаць даследчыцкімі навыкамі.

АК-4. Умець працаваць самастойна.

АК-5. Быць здольным знаходзіць новыя ідэі (валодаць крэатыўнасцю).

АК-6. Валодаць міждысцыплінарным падыходам пры вырашэнні праблем.

АК-7. Мець навыкі, звязаныя з выкарыстаннем тэхнічных сродкаў, кіраваннем інфармацыяй і працай з камп’ютарам.

АК-9. Умець вучыцца, павышаць сваю кваліфікацыю на працягу ўсяго жыцця.

*Патрабаванні да сацыяльна-асобасных кампетэнцый*

Студэнт павінен:

СЛК-5. Быць здольны да крытыкі і самакрытыкі.

СЛК-6. Умець працаваць у камандзе.

СЛК-7. Быць здольным ажыццяўляць самаадукацыю і ўдасканальваць прафесійную дзейнасць.

*Патрабаванні да прафесійных кампетэнцый*

Студэнт павінен быць здольны:

ПК-1. Кіраваць вучэбна-пазнаваўчай і вучэбна-даследчай дзейнасцю навучэнцаў.

ПК-2. Выкарыстоўваць аптымальныя метады, формы і сродкі навучання.

ПК-3. Арганізоўваць і праводзіць вучэбныя заняткі розных відаў і форм.

ПК-4. Арганізоўваць самастойную работу навучэнцаў.

ПК-8. Фарміраваць базавыя кампаненты культуры асобы навучэнца.

ПК-12. Развіваць навыкі самастойнай работы навучэнцаў з вучэбнай, даведачнай, навуковай літаратурай і інш. сродкамі інфармацыі.

ПК-16. Ацэньваць вучэбныя дасягненні навучэнцаў, а таксама ўзроўні іх выхаванасці і развіцця.

ПК-17. Ажыццяўляць прафесійную самаадукацыю і самавыхаванне з мэтай удасканалення прафесійнай дзейнасці.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен ***ведаць***:

– асновы тэорыі і гісторыі літаратуры, літаратурнай крытыкі;
– прынцыпы і прыёмы літаратуразнаўчага аналізу мастацкіх тэкстаў;
– змест паняццяў і праблемы вывучэння літаратурных метадаў, накірункаў і плыняў, сістэмы мастацкіх вобразаў і жанраў;
– сюжэтна-кампазіцыйныя асблівасці твораў і сродкі мастацкай выразнасці;
– магчымасці і межы прымянення метадаў і прыёмаў аналізу, характэрных для найважнейшых сучасных літаратуразнаўчых школ.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Тэорыя літаратуры» студэнт павінен ***умець:***

– даць вызначэнне асноўным літаратуразнаўчым тэрмінам і паняццям;

– выяўляць падобнае і адметнае ў літаратурах розных часоў і народаў;

– спалучаць набытыя тэарэтычныя веды з вывучэннем канкрэтных мастацкіх з'яў;

– раскрываць нацыянальную адметнасць і індывідуальна-аўтарскую інтэрпрэтацыю жыццёвых і літаратурных з'яў;

– вызначыць месца твора ў мастацкай сістэме пісьменніка, у літаратуры свайго часу і іншых эпох;

– скласці тэсты па літаратурных творах пэўнай эпохі, пэўнага роду літаратуры, пэўнага жанру.

– працаваць з тэарэтычнай, навукова-крытычнай і даведачнай літаратурай.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Тэорыя літаратуры" студэнт павінен ***валодаць:***

– літаратуразнаўчай тэрміналогіяй, здольнасцю кваліфікавана будаваць выказванне пра літаратуразнаўчыя з'вы;

– навыкамі абагульнення і сістэматызацыі вывучанага, вылучэння галоўнага, істотнага, бачання адметнага пры параўнанні розных літаратурных твораў;

– асноўнымі падыходамі да аналізу літаратуразнаўчых катэгорый ў мастацкім тэксце.

У аснову структуравання зместу вучэбнага матэрыялу дадзенай дысцыпліны пакладзены прынцып тэматычнага падыходу, які прадугледжвае падзел вучэбнага матэрыялу на адносна самастойныя раздзелы (тэмы).

Па кожнай вучэбнай тэме ў адпаведнасці з яе мэтамі і задачамі па фарміраванні і развіцці ў студэнтаў канкрэтных кампетэнцый выкладчык (кафедра) праектуе і рэалізуе канкрэтныя педагагічныя тэхналогіі.

Асноўнымі тэхналогіямі навучання з'яўляюцца: праблемнае навучанне (праблемнае выкладанне, пошукавы метад); камунікатыўныя

тэхналогіі, заснаваныя на актыўных формах і метадах навучання (дыскусія, круглы стол, прэзентацыя, работа ў групах); асобасна арыентаваная тэхналогія.

*Агульная колькасць гадзін, колькасць аўдыторных гадзін, форма атрымання вышэйшай адукацыі, размеркаванне аўдыторных гадзін, форма атэстацыі.*

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Тэорыя літаратуры» (спецыяльнасць 1–02 03 01 «Беларуская мова і літаратура») разлічана на 180 гадзін. З іх 80 аўдыторных гадзін: 50 лекцыйных (2 КСР) і 30 практычных (2 КСР). 4,5 заліковыя адзінакі. Форма атэстацыі – залік (VI ссеместр), экзамен (VII семестр).

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Тэорыя літаратуры» (спецыяльнасць 1-02 03 03 “Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (з указаннем мовы)” разлічана на 164 гадзіны. З іх 80 аўдыторных гадзін: 50 лекцыйных (2 КСР) і 30 практычных (2 КСР). 4 заліковыя адзінкі. Форма атэстацыі – экзамен (VII семестр).

На самастойную работу студэнтаў (спецыяльнасць 1–02 03 01 «Беларуская мова і літаратура») адведзена 64 гадзіны: тэма 1.1 – 6 гадзін, тэма 1.2 – 17 гадзін, тэма 2.1 – 3 гадзіны, тэма 2.2 – 18 гадзін, тэма 3.1 – 5 гадзін, тэма 3.2 – 5 гадзін, тэма 3.3 – 10 гадзін.

На самастойную работу студэнтаў (спецыяльнасць 1-02 03 03 Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (з указаннем мовы)” адведзена 48 гадзіны: тэма 1.1 – 5 гадзін, тэма 1.2 – 10 гадзін, тэма 2.1 – 2 гадзіны, тэма 2.2 – 15 гадзіны, тэма 3.1 – 5 гадзін, тэма 3.2 – 3 гадзіны, тэма 3.3 – 8 гадзін.

Раздзелы (тэмы), па якіх праводзяцца рэйтынгавыя кантрольныя работы: тэмы 1.1 – рэйтынгавая кантрольная работа № 1; тэма 1.2 – рэйтынгавая кантрольная работа № 2; тэмы 2.1– 2.2 – рэйтынгавая кантрольная работа № 3, тэма 3.1 – рэйтынгавая кантрольная работа № 4, тэмы 3.2 – 3.3 – рэйтынгавая кантрольная работа № 5.

На вувучэнне дысцыпліны “Тэорыя літаратуры” (спецыяльнасць 1–02 03 01 «Беларуская мова і літаратура») пры завочнай форме атрымання адукацыі вучэбным планам адводзіцца 80 гадзін. З іх 18 аўдыторных гадзін: 14 лекцыйных, 4 практычныя. 4 заліковыя адзінкі. Форма атэстацыі – экзамен (X семестр).

На самастойную работу студэнтаў завочнай формы атрымання адукацыі (спецыяльнасць 1–02 03 01 «Беларуская мова і літаратура») адведзена 62 гадзіны: тэма 1.1 – 6 гадзін, тэма 1.2 – 18 гадзін, тэма 2.1 – 4 гадзіны, тэма 2.2 – 18 гадзін, 3.1 – 6 гадзін, тэма 3.2 – 4 гадзіны, тэма 3.3 – 6 гадзін.

*Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў.* Пры вывучэнні вучэбнай дысцыпліны «Тэорыя літаратуры» выкарыстоўваюцца такія формы самастойнай работы, як выкананне індывідуальных заданняў на практычных занятках пад кантролем выкладчыка, выкананне

індывідуальных заданняў пазааўдыторна (кіруемая самастойная работа студэнтаў), напісанне рэфератаў, падрыхтоўка дакладаў для выступлення на студэнцкіх навуковых канферэнцыях і інш.

Размеркаванне гадзін па семестрах:
Для спецыяльнасці 1–02 03 01 «Беларуская мова і літаратура»

| Семестр | Усяго | Лекцыі / СКРС | Практычныя/ СКРС | Самастойная работа студэнтаў | Форма кантролю |
|---|---|---|---|---|---|
| VI | 100 | 32/2 | 20/2 | 44 | Залік |
| VII | 80 | 14/2 | 6/2 | 20 | Экзамен (36 г.) |
| **Усяго за перыяд навучання** | **180** | **46/4** | **26/4** | **64** | **36** |

Для спецыяльнасці 1-02 03 03 “Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (з указаннем мовы)”

| Семестр | Усяго | Лекцыі / СКРС | Практычныя/ СКРС | Самастойная работа студэнтаў | Форма кантролю |
|---|---|---|---|---|---|
| VI | 88 | 32/2 | 20/2 | 32 | |
| VII | 76 | 14/2 | 6/2 | 16 | Экзамен (36г.) |
| **Усяго за перыяд навучання** | **164** | **46/4** | **26/4** | **48** | **36** |

Вучэбным планам (завочная форма атрымання адукацыі) для спецыяльнасці 1–02 03 01 “Беларуская мова і літаратура” на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Тэорыя літаратуры” прадугледжана 14 лекцыйных і 4 практычных гадзін.

Размеркаванне гадзін па семестрах:

| Семестр | Усяго | Лекцыі | Практычныя | Самастойная работа студэнтаў | Форма кантролю |
|---|---|---|---|---|---|
| IX | 94 | 8 | 2 | 84 | |
| X | 50 | 6 | 2 | 42 | Экзамен (36 г.) |
| **Усяго за перыяд навучання** | **180** | **14** | **4** | **126** | **36** |

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## І. АСНОВЫ ТЭОРЫІ ЛІТАРАТУРЫ

### 1.1 Агульныя праблемы тэорыі літаратуры

1.1.1 *Тэорыя літаратуры і метадалогія ў сістэме літаратуразнаўства.* Узнікненне навукі аб літаратуры. Прадмет і задачы літаратуразнаўства. Асноўныя катэгорыі, паняцці, тэрміны. Дапаможныя навукі ў літаратуразнаўстве. Сувязь з гуманітарнымі, прыродазнаўчымі, тэхнічнымі навукамі. Размежаванне тэорыі, гісторыі, літаратурнай крытыкі па аб’екту даследавання. Прадмет і задачы тэорыі літаратуры. Паняцце пра паэтыку, яе віды. Прадмет і задачы гісторыі літаратуры. Метадалогія сярод літаратуразнаўчых навук.

1.1.2 *Літаратура як від мастацтва.* Месца літаратуры сярод іншых відаў мастацтва. Матэрыялістыстычныя і ідэалістычныя канцэпцыі сутнасці мастацкай творчасці. Антычныя тэорыі мастацтва як перайманне жыцця. Платонаўская тэорыя “ценю ценяў”, мастацтва як “памяць душы”. Перайманне жыцця па закону неабходнасці ці верагоднасці ў канцэпцыі Арыстоцеля. Паняцце катарсісу. “Паэтыка” Арыстоцеля. Развіццё ідэй Платона і Арыстоцеля філосафамі і творцамі Сярэднявечча і Рэнесансу (Аўгусцін Блажэнны, Леанарда да Вінчы, інш.). Эстэтычныя тэорыі новага часу: класіцыстычная (Буало), асветніцкая (Гольбах, Гельвецый, Дзідро). Канцэпцыі сутнасці мастацкай творчасці як суб’ектыўнай творчай здольнасці. Філасофскія ідэі Канта, Фіхтэ, Шапенгаўэра. Разуменне мастацкай творчасці рамантыкамі (Наваліс, Шлегель і інш.). Абсалютызацыя свабоды творцы, рэзкае супрацьпастаўленне мастацтва рэальнаму жыццю, “двухсветавасць” рамантычнай літаратуры. Сутнасць літаратуры як слоўнае выяўленне асабістага псіхалагічнага стану мастака (канцэпцыі А. Пацябні, З. Фрэйда, А. Бергсана, Б. Крачэ). Тэорыі “фенаменалізму” (Н. Гартман, Р. Інгардэн). Мастацтва як адзін з нямногіх сродкаў “свабоднага самавыяўлення” чалавека, спасціжэння экзістэнцыяльнага быцця ў праграмных трактатах К. Ясперса, М. Хайдэггера, П. Сартра. Аб’ектыўна-гістарычныя канцэпцыі сутнасці мастацтва. Філасофская сістэма Гегеля. Асноўныя яе палажэнні: “абсалютная ідэя” і “ідэя прыгожага”. Матэрыялістычная тэорыя М. Чарнышэўскага. Разуменне літаратуры як адлюстравання і выяўлення духоўнага жыцця грамадства прадстаўнікамі культурна-гістарычнай школы (І. Тэн, Г. Гетнер, А. Пыпін і інш.). Сучасныя тэорыі сутнасці мастацкай творчасці (ХХ – ХХI стст .). Тэорыя вобразнай сутнасці мастацтва. Мастацтва як непасрэднае ідэалагічнае пазнанне сацыяльнай характэрнасці чалавечага жыцця і звязанай з ім натуральнай прыроды

(Г. Паспелаў). Тэорыі дыялагічнасці тэксту (М. Бахцін, Ю. Лотман), тэксту як цалкам замкнутай ў сабе сістэмы моўных знакаў (Ю. Лотман). Постмадэрнісцкае разуменне сутнасці творчасці.

1.1.3 *Мастацкі вобраз*. Вобраз як асноўная адзінка мастацкай формы і зместу. Літаратуразнаўчыя падыходы ў трактоўцы прыроды вобраза: 1) уласцівасць мовы мастацкага твора, 2) сістэма канкрэтна-пачуццёвых дэталей. Шырокае і вузкае разуменне тэрміна (вобраз-твор, вобраз-характар, вобраз-карціна, вобраз-дэталь, мастацкі троп). Этапы (узроўні фарміравання мастацкага вобраза (задума, мастацкае ўзнаўленне, успрыманне). Структура мастацкага вобраза як сінтэзнае засваенне акаляючага свету: спалучэнне аб'ектыўнага і суб'ектыўнага, жыццёвай верагоднасці і ўмоўнасці, тыповага і індывідуальна-непаўторнага. Выяўленне мастацкай экспрэсіўнасці ў творы (пафас). Віды пафасу. Аўталагічны і металагічны тыпы вобраза. Гратэскавы вобраз. Падтэкст. Вечныя вобразы, іх мадыфікацыі. Вобраз-характар. Вобраз-тып. Архетып. Сістэма вобразаў у лірычным, эпічным, драматычным творах. Пытанне пра вобраз аўтара, апавядальніка, чытача.

**1.2 Літаратурныя роды і жанры.**

1.2.1 *Літаратурныя роды.* Тэарэтычнае абгрунтаванне падзелу літаратуры на роды ў залежнасці ад адносін мастацкіх твораў да аб'екта і суб'екта творчасці (Арыстоцель, Гегель, Бялінскі і інш.). Узнаўленне (у эпасе) і выяўленне (у лірыцы) як зыходныя моманты ў агульнай тыпалогіі мастацкай літаратуры. Эпічны свет як цалкам замкнутая ў самой сабе аб'ектыўная рэальнасць. Лірыка як самавыяўленне суб'екта творчасці. Драматычная літаратура як сінтэз эпічнага і лірычнага спосабаў узнаўлення жыцця, як адзінства аб'ектыўнага і суб'ектыўнага пачаткаў мастацкай творчасці. Крытыка дадзенай канцэпцыі. В. Бялінскі пра "змешанасць" трох родаў літаратуры ў мастацкай практыцы. Узнікненне літаратурных родаў па канцэпцыі А. Весялоўскага, наяўнасць у кожным з іх аб'ектыўнага і суб'ектыўнага пачаткаў.

Родавыя асаблівасці зместу і формы эпічных твораў. Спосаб стварэння эпічнага вобраза. Сюжэт як засваенне жыцця ў яго руху і часавым вымярэнні. Апавядальна-апісальная структура эпічнага твора. Прадмет лірычнага выяўлення. Паняцце пра лірычнага героя. Лірычны змест як існаванне і ўзаемадзеянне лірычных матываў. Спецыфіка рытмічнай арганізацыі зместу твора. Драма як узнаўляльны, "пабочны род" (Г. Паспелаў), літаратуры, як магчымасць сінтэзу паміж мастацтвам слова і мастацтвам пантамімы. Самакаштоўнае значэнне дзеяння ў драме, формы яго выяўлення. Функцыя аўтарскай мовы (рэмаркі) ў

драматургічным творы. Вызначальныя рысы эпасу (наяўнасць характараў – дзючых асоб), лірыкі (самавыяўленне лірычнага героя), драмы (абумоўленасць дзеянняў персанажа унутраным парывам). Спецыфіка слова ў мастацкім творы (прамое, ускоснае, іншасказальнае). Асаблівасці мовы эпасу, лірыкі, драмы.

1.2.2 *Жанр і жанравыя формы.* Паняцце пра жанр як форму, у якой існуюць літаратурныя роды. Жанравы змест (тэматыка, праблематыка, пафас і г.д.) і жанравая форма (суб'ектная арганізацыя тэксту, хранатоп, асацыятыўны фон і інш.). Станаўленне жанравай структуры мастацтва слова (вылучэнне эпічных, драматычных, лірычных жанраў). Сістэма жанраў, яе асаблівасці на розных этапах гістарычнага развіцця літаратуры. Нацыянальны характар спецыфікі жанравай сістэмы. Прынцыпы вылучэння жанраў у эпасе, лірыцы, драме. Класічныя жанры, іх генезіс і гістарычная эвалюцыя (ода, элегія, санет, эпіграма, трагедыя, камедыя, інш.). Спецыфіка і адметнасць сатырычнага адлюстравання жыцця. Жанры сатырычнай літаратуры. Жанр і жанравыя формы (жанравыя мадыфікацыі).

*1.2.2.1 Жанры лірыкі.* Тыпалогія лірычнага роду. Прадметна-тэматычныя разнавіднасці лірычных твораў. Класіфікацыя па тыпах мастацкай змястоўнасці (гераічны, эталагічны, сентыментальны, сатырычны, інш.) і пафасу. Жанры з жорсткім адзінствам формы і зместу (ямб, пастараль, стансы, трыялет, канцона, актава, інш.) на ранніх стадыях мастацкага развіцця. Іх гістарычная эвалюцыя як здольнасць да ўзнаўлення новага тыпу мастацкай змястоўнасці (элегія, эпіграма, санет), да абнаўлення фармальных асаблівасцей (ода, сатыра). Свабоднае спалучэнне мастацкага зместу і формы як прыкмета сучаснай лірыкі. Абнаўленне жанравай сістэмы ў розныя перыяды развіцця літаратуры праз зварот да класічных жанраў і іх перастварэнне. "Новажанры" і аўтарскія формы ў сучаснай паэзіі. Празаізаваныя формы лірыкі (верлібр, верш у прозе, паэма ў прозе).

*1.2.2.2 Эпічныя жанры.* Старажытнае / антычнае разуменне эпасу як аповеду пра гістарычнае і міфалагічнае мінулае. Тыпалогія эпічнага роду. Эпапея як літаратурны жанр, яе асноўныя характарыстыкі. Выснова Гегеля і Бялінскага пра немагчымасць з'яўлення паэмы-эпапеі ў літаратуры новага часу. Раман як аналаг эпапеі па свайму значэнню ў сістэме жанраў. Пытанне пра час ўзнікнення рамана (М. Бахцін, В. Кожынаў і інш.). Гістарычная эвалюцыя, месца рамана ў сістэме жанраў розных літаратурных напрамкаў. Гегель, В. Бялінскі, М. Бахцін пра спецыфіку жанру. Жанравыя мадыфікацыі рамана ў сусветнай і нацыянальнай

літаратурах. “Сярэднія” і “малыя” апавядальныя формы: аповесць, навела, апавяданне. Іх жанравыя адметнасці і разнавіднасці. Тыпы мастацкага зместу (героіка, сентыментальнасць, рамантыка, трагізм, драматызм, інтэлектуальнасць, інш.).

*1.2.2.3 Жанры драмы.* Трагедыя: змест назвы. Сувязь старажытнагрэчаскай трагедыі з абрадавымі дзейстамі і абрадавым хорам. Жанравыя характарыстыкі трагедыі, гістарычная эвалюцыя. Пытанне пра трагедыю ў новай літаратуры. Сутнасць трагічнага канфлікту на розных этапах літаратурнага развіцця. Камедыя: гісторыя нараджэння, жанравая спецыфіка. Старажытнагрэчаская і старажытнарымская камедыя. Антычныя трагікі і камедыёграфы. Эпоха Рэнесансу як новы этап у развіцці жанру. Жанравыя формы і разнавіднасці сучаснай камедыі. Літаратурныя і фальклорныя формы драмы эпохі Сярэнявечча, Рэнесансу і Асветніцтва: літургійная драма, містэрыя, інтэрмедыя, інтэрлюдыя, соці, фарс, маралітэ, камедыя дэль артэ і інш. Узнікненне драмы як “сярэдняга” жанру, як п’есы з пераважна драматычным тыпам мастацкага зместу. Меладрама, вадэвіль. Формы міжжанравага сінтэзу (трагікамедыя, трагіфарс).

*1.2.2.4 Памежныя (міжродавыя) ўтварэнні.* Мастацкія формы са змешанымі родавымі, жанравымі і родава-жанравымі прыкметамі. Праблема родава-жанравага сінтэзу (родава-жанравай дыфузіі) у сучаснай літаратуры. Мастацка-дакументальныя і мастацка-публіцыстычныя жанры: эсэ, споведзь, мемуары, нарыс, памфлет. Літаратурна-фальклорныя жанры: казка, паданне.

Паэма як жанр. Яе гістарычная эвалюцыя. В. Бялінскі пра сутнасць паэмнага ўзнаўлення рэчаіснасці. Прынцыпы класіфікацыі паэмы. Эпічная, лірычная, драматычная, ліра-эпічная, ліра-эпіка-драматычная паэма: асноўныя характарыстыкі. Фальклорная і літаратурная формы балады. Балада рамантычная і рэалістычная: асаблівасці зместу. Суаднесенасць у баладных творах лірычнага, эпічнага і драматычнага пачаткаў. Байка як адзін з самых старажытных жанраў. Генетычная сувязь байкі з казкай пра жывёл. Адметнасць зместу і формы байкі. Драматычныя формы міжжанравага сінтэзу: трагікамедыя, трагіфарс. Жанравая асаблівасць і жанравыя разнавіднасці мемуарнай літаратуры: некролаг, пісьменніцкія нататкі, літаратурны партрэт, дзённік, мастацкая біяграфія.

*1.2.2.5 “Аўтарскія” жанравыя формы.* Статыка і дынаміка ў сістэме жанру. Паняцце пра жанравы канон. Абнаўленне паэтыкі жанру як перадумова яго існавання на працягу доўгага часу. Пытанне пра

“аўтарскія” жанры і жанравыя формы (на прыкладзе твораў Я. Брыля, А. Разанава, Р. Барадуліна).

## II. ЛІТАРАТУРНЫ ПРАЦЭС

2.1 *Літаратурны працэс як сістэма. Перыядызацыя.* Вызначэнне літаратурнага працэсу. Асноўныя катэгорыі і тэрміны. Тэндэнцыі, характар, заканамернасці развіцця слоўнага мастацтва. Праблема паскоранасці. Сутнаснае напаўненне дадзенай праблемы ў савецкім літаратуразнаўстве. Паняцце пра дыскрэтнасць. Традыцыя і наватарства ў літаратуры. Знешнія і ўнутраныя фактары развіцця літаратурнага працэсу. Тэорыя стадыяльнасці. Перыядызацыя сусветнага і нацыянальнага літаратурнага працэсу. Спрэчныя аспекты ў перыядызацыі сусветнай літаратуры. Сучасны літаратурны працэс: часавыя параметры, прынцыпы вылучэння этапаў.

2.2 *Літаратурныя эпохі, кірункі, плыні, школы.* Паняцце пра мастацкую сістэму, творчы метад, эпоху, літаратурны напрамак, школу. Гісторыя літаратурных напрамкаў як гісторыя ўзаемадзеяння і барацьбы паміж імі. Нарматыўныя эстэтычныя прынцыпы і супрацьстаянне ім вялікага таленту.

2.2.1 *Універсальныя мастацкія сістэмы Антычнасці і Сярэднявечча.* Паняцці пра Старажытнасць і Антычнасць. Сінкрэтызм як адметная асаблівасць твораў мастацтва ў гэтыя эпохі. Роля міфалогіі ў станаўленні літаратуры. Складнікі літаратуры, у т.л. гістарыяграфія, філасофская проза, красамоўства, прыродазнаўчыя творы. Зараджэнне літаратурных родаў, відаў, жанраў. Устойлівасць сістэмы стыляў. Завершанасць антычнай паэтыкі. Спецыфіка антычнага вершаскладання. Фармуляванне асноўных эстэтычных паняццяў і катэгорый. Зараджэнне навукі аб літаратуры.

Мастацкая сістэма Сярэднявечча. Складнікі літаратуры. Спалучэнне старажытнага і сярэднявечнага ў ёй. Адпаведнасць саслоўнай структуры сярэднявечнага грамадства. Дзве ідэйна-творчыя плыні ў літаратуры Ранняга Сярэднявечча. Сімволіка і алегарызм мыслення. Сістэма жанраў і стыляў. Шматмоўнасць як адметная рыса эпохі. Перакладная літаратура, яе месца ў літаратурным працэсе. Праблема аўтарства.

2.2.2 *Эпоха Рэнесансу.* Паходжанне назвы. Глыбокая цікавасць да антычнасці і яе мастацтва. Гуманістычная канцэпцыя чалавека і свету. Антрапацэнтрызм. Утопія. Парадаксальнасць эпохі: суіснаванне апалогіі “здаровага сэнсу” і містыкі. Перыяды ў развіцці культуры Рэнесансу.

Сусветна вядомыя постаці мастакоў слова. Рэнесансныя тэндэнцыі на землях ВКЛ.

2.2.3 *Барока і класіцызм.* Часавыя і геаграфічныя межы першых у гісторыі мастацтва літаратурных напрамкаў. Барока як сінтэз мастацтва дзвюх эпох – Сярэднявечча і Рэнесансу. Сутнасць барочнай мастацкай канцэпцыі. Паэтыка літаратурнага барока. Картэзіянства як філасофская аснова класіцызму. Эстэтычная сістэма французскіх “класікаў”. “Паэтыка” Буало. Асноўны канфлікт у суаднесенасці з гістарычным развіццём абсалютызму. Прынцып пераймання (прыроды, антычнага мастацтва). Прынцып строгага рацыяналізму (падзел жанраў, густаў, стыляў; сістэма герояў; правілы чатырох адзінстваў). Фармальныя адзнакі стылю. Арыентацыя на выхаваўчую ролю мастацтва. Прадстаўнікі класіцызму.

2.2.4 *Асветніцтва.* Асветніцтва як ідэйна-культурны рух і мастацкая сістэма. Культ Навукі і Розуму. Канцэпцыя “свабоднага”, “прыроднага”, “чыстага” чалавека. Шляхі негвалтоўнай перабудовы грамадства (ідэя стваральнай працы, выхавання з дапамогай навук і мастацтваў, у народным асяроддзі, з дапамогай маральнай пропаведзі, інш.). Напрамкі (асветніцкі класіцызм, асветніцкі рэалізм, сентыменталізм), жанры, прадстаўнікі.

2.2.5 *Сентыменталізм. Рамантызм.* Пачуццё як асноўная чалавечая каштоўнасць і вымярэнне ў эстэтыцы сентыменталістаў. Зварот да прыроды, да патрыярхальнага стану развіцця грамадства, крытыка цывілізацыі. Дэмакратызацыя героя літаратуры і мовы. Змены ў сістэме жанраў. Паняцце пра перадрамантызм. Тэарэтычныя працы і маніфесты прадстаўнікоў рамантызму (братоў Шлегеляў, Навалiса ў нямецкай літаратуры, Шэллі, Вордстварта, Колрыджа ў англійскай, Гюго ў французскай і інш.). Ідэя абсалютнай свабоды творчасці, прарочай місіі творцы. “Двухсветавасць” мастацтва. Адметнасць рамантычнага героя. “Байранізм” у літаратуры і ў рэальным жыцці. Цікавасць да культуры і мастацтва Сярэднявечча, да сапраўднай, а не міфалагізаванай гісторыі народаў, да хрысціянскіх матываў і вобразаў. Узбагачэнне жанравай сістэмы. Паняцце пра неарамантызм.

2.2.6 *Рэалізм. Натуралізм.* Рэалізм як напрамак і як тып творчасці. Пытанне пра часавыя межы рэалізму. Асноўныя прынцыпы рэалістычнага мастацтва: праўдзівасць, тыповасць, ідэйнасць, народнасць, дэмакратызм, сацыяльнасць, гістарызм. Іх трактоўка ў розныя гістарычныя перыяды. Канцэпцыя чалавека і свету. Пашырэнне тэматыкі твораў. Жыццёпадобнасць героя і абставін. Дэміфалагізацыя літаратуры. Росквіт раманнага жанру. Тыпы рэалізму (крытычны, сацыялістычны, міфалагічны, неарэалізм і інш.). Нарматыўнасць і рэгламентаванасць

тэорыі сацрэалізму, трактоўка прынцыпаў класавасці, партыйнасці, народнасці. Спробы абнаўлення паэтыкі: канцэпцыя сацыялістычны рэалізм як “адкрытая сістэма”.

Нявырашанасць пытання пра месца натуралізму ў сістэме сусветнага літаратурнага працэсу. Погляды Эміля Заля на рэалізм і натуралізм. Асноўныя характарыстыкі натуралізму: абсалютызацыя ў чалавеку “прыроднага пачатку”, біялагічнай існасці, спадчыннасці; фактаграфізм, перанясенне ў літаратуру прынцыпаў навуковага аналізу, пісьменнік як “рэгістратар фактаў”, твор – дакладная копія жыцця. Свядомы зварот да “забароненых” тэм, “нізкіх” фабул, малапрывабных аспектаў жыцця.

2.2.7 *Нерэалістычная літаратура. Дэкаданс*. Філасофія дэкадансу (ідэі Ф. Ніцшэ, А. Шапэнгаўэра, А. Бергсона). Літаратурныя кірункі дэкадансу. Паняцце пра сімвал. Твор як “лес сімвалаў” (Д. Меражкоўскі). Трактат М. Метэрлінка “Скарбы ўтаймаваных” і яго “маленькія драмы” як этапныя ў тэорыі і мастацтве сімвалізму. Сімвалізм паэзіі П. Верлена. Зварот да сімвалаў, іх спецыфіка ў творах беларускіх пісьменнікаў (Купала) Імпрэсіянізм у выяўленчым мастацтве, музыцы, літаратуры. Шматфарбнасць, хутказменлівасць свету і ўражанняў. Змястоўныя і фармальныя адзнакі стылю. М. Багдановіч як паэт-імпрэсіяніст. Эстэтызм: суадносіны мастацтва і жыцця ў тэорыі і практыцы. Асноўныя палажэнні працы О. Уайльда “Выдумкі”, рэалізацыя эстэтычнай праграмы ў яго творах.

2.2.8 *Мадэрнізм. Авангардызм і неаавангардызм.* Вызначэнне паняццяў. Час і прычыны ўзнікнення так званага сучаснага мастацтва. Філасофскія асновы (фрэйдызм, аналітычная псіхалогія К.Г. Юнга і інш.), іх рэалізацыя ў творах пісьменнікаў. Тэарэтычныя праграмы і маніфесты. Літаратурныя кірункі і плыні (кубізм, дадаізм, сюррэалізм, футурызм, імажынізм, экспрэсіянізм, “плынь свядомасці” і інш.). Свядомая ўстаноўка на элітарнасць творчасці. Рашучае адмаўленне прынцыпаў рэалізму і натуралізму, закладзеных папярэднімі напрамкамі традыцый. Перавага формы над зместам. Асноўныя прыёмы і сродкі стварэння мастацкага свету. Канцэпцыя чалавека і свету. Хранатоп. Экзістэнцыялізм як філасофія і літаратурная з’ява 2-й пал. ХХ ст. Асноўныя катэгорыі, іх рэалізацыя ў творчасці французскіх (Ж.П. Сартр, А. Камю), беларускіх (В. Быкаў) пісьменнікаў. Паняцце пра неаавангардызм (“тэатр абсурду”, “новы раман”, “канкрэтная” паэзія).

2.2.9 *Постмадэрнізм.* Постмадэрнізм як сістэма светабачання, метад і напрамак. Сутнасць паняццяў сімулякр, тэкст, генатэкст. Постмадэрнізм – “тэатральнасць сучаснай культуры” (І. Хассан). Асноўныя характарыстыкі

постмадэрнісцкіх твораў: зліццё гістарычных і мастацкіх традыцый, сціранне мяжы паміж "сваім" і "чужым", збліжэнне элітарнай мадэрнісцкай літаратуры з літаратурай масавай, "фіналісцкі" характар культуры. Прыёмы постмадэрнісцкага пісьма, жанры літаратуры.

## III. АНАЛІЗ ЛІТАРАТУРНАГА ТВОРА

### 3.1 Літаратуразнаўчыя метады

3.1.1 *Паняцце пра метад.* Метады мастацкія і навуковыя. Агульнанавуковыя. Літаратуразнаўчае разуменне метаду. Сувязь паняццяў напрамак, стыль__з мастацкім метадам. Гістарычна першыя шляхі вывучэння мастацкага твора. Сучасныя метады і школы. *Міфалагічная і неаміфалагічная (рытуальна-міфалагічная) школы.* Міфалагічная школа і яе вытокі (працы Дж. Віко, І.Г. Гердэра). Уклад нямецкіх рамантыкаў ("Нямецкая міфалогія" Я. Грыма). Рэканструяванне старажытных міфаў на аснове фальклорных твораў розных народаў. Падабенства сюжэтна-вобразнай структуры казак як вынік іх агульнага паходжання з міфаў (браты Грым), дзякуючы законам логікі (Ф. Буслаеў). Пераход фальклорных сюжэтаў у літаратуру, з літаратуры – у народную творчасць іншых народаў (Л. Бараг). Уклад беларускіх этнографаў, фалькларыстаў, літаратуразнаўцаў у развіццё міфалагічнага напрамку.

3.1.2 *Біяграфічны метад.* Праца Ш.А. Сент-Бёва "Літаратурна-крытычныя партрэты". Асноўныя складнікі метаду. Адрозненне літаратуразнаўчага даследавання ад твораў біяграфічнага жанру. Твор як прадукт біяграфічнага аўтара. Развіццё магчымасцей метаду ў працах вучоных у пазнейшыя часы. Выкарыстанне прынцыпаў біяграфічнага метаду ў адукацыйных праграмах для сярэдніх навучальных устаноў і ВНУ Беларусі.

*Культурна-гістарычная школа.* Апора на пазітывізм (Г. Спенсер, А. Конт). Працяг традыцый Сент-Бёва, выяўленне сувязей твора з рэальнасцю. Сутнасць вылучаных французскім філосафам, гісторыкам, крытыкам І.-А. Тэнам паняццяў "раса", "асяроддзе", "момант". Значэнне метаду ў развіцці літаратуразнаўства. Прадстаўнікі культурна-гістарычнай школы на Беларусі. *Параўнальна-гістарычны метад.* Вылучэнне А.М. Весялоўскім асноўнага элемента ("непадзельная адзінка сюжэта", матыў) у творчасці прадстаўнікоў розных часоў і народаў. Ідэя "самазараджэння" матываў і іх "міграцыі". Эвалюцыйны характар метаду. Пошукі тыпалагічных сыходжанняў і міжлітаратурных сувязей. "Гістарычная паэтыка" А.М. Весялоўскага, яе значэнне для фарміравання

прынцыпа гістарызму. Увага да паўтаральнасці літаратурных з’яў. Параўнальна-гістарычны метад як аснова кампаратывістыкі. Яго суданосіны з агульнанавуковым параўнальным метадам.

3.1.3 *Сацыялагічны метад. Фармальны метад.* Разуменне літаратуры як адной з форм грамадскай свядомасці, твора – як адлюстравання сацыяльна-тыповага ў жыцці чалавека і грамадства. Філасофская аснова метаду: пазітывізм, марксізм – “чалавек як чалавек грамадскі” (К. Маркс). Роля рускай крытыкі XIX ст. (В. Бялінскі, М. Чарнышэўскі, М. Дабралюбаў, Д. Пісараў) у замацаванні асноўных ідэй сацыялагічнага падыходу да мастацтва. Паняцці пра тэндэнцыйнасць і сацыяльны заказ у мастацтве. Прынцыпы класавасці, партыйнасці, народнасці. Выкарыстанне крытыкамі і літаратуразнаўцамі прынцыпаў і прыёмаў іншых навук (філасофіі, псіхалогіі, эстэтыкі, лінгвістыкі, сацыялогіі, культуралогіі, дакладных навук). Развіццё тэорыі ў працах Б. Брэхта, Т. Адорна, А. Хаўзэра, Г. Маркузэ, Г. Лукача і інш. Вульгарызацыя метаду ў савецкім літаратуразнаўстве 1920–30-х гг. Р. Гарадзі і яго тэорыя “рэалізм без берагоў”. Новыя падыходы ў вызначэнні рэалістычнага мастацтва.

Фармальны метад. Фармальная школа і яе набыткі. Артыкул Б. Эйхенбаўма “Як зроблена “Шынель” Гогаля”. Гіпотэза Р. Якабсона і Ю. Тынянава пра сістэмны характар мовы і літаратуры. Літаратурны твор як “канструкцыя”: «…Не рэч, не матэрыял, а адносіны матэрыялаў» (В. Шклоўскі). Акцэнтацыя ўвагі на прыёмы, што дазваляюць пераствырыць рэальны факт у факт літаратурны. Распрацоўка Б. Тамашэўскім пытанняў паэтыкі літаратурных жанраў, паэтычнай мовы, вершаскладання, кампазіцыі (“Кароткі курс паэтыкі”). Твор як закрытая сістэма са сваімі складнікамі. Плённасць метаду для развіцця літаратуразнаўства.

3.1.4 *Псіхалагічны напрамак у літаратуразнаўстве. Структурны метад.* Увага да псіхалогіі аўтара і псіхалогіі чытача. Сувязь з псіхалогіяй мастацкай творчасці (у т.л. агульнай псіхалогіяй Л. Выгоцкага), з лінгвістыкай (А.А. Патабня), з філасофіяй інтуітывізму (А. Бергсон), фрэйдызму (З. Фрэйд), аналітычнай псіхалогіяй (К.Г. Юнг), з дзейнасцю псіхалагічных школ. Вылучэнне ролі індывідуальнага пачатку ў мастацтве. Разуменне твора (і мастацкай дзейнасці творцы) як працэсу глыбока ўнутранага, канчаткова неспасцігальнага. Увага да шматзначнасці, невычарпальнасці мастацкага вобраза. Актуальнасць даследаванняў літаратуры з пазіцый псіхалагічнага падыходу ў наш час.

Структурны метад. Роля членаў Пражскага лінгвістычнага гуртка, Парыжскай семіятычнай школы, Тартуска-маскоўскай школы ў распрацоўцы прыёмаў структурнага аналізу літаратуры як другаснай семіятычнай сістэмы. Вывучэнне твора як рознаўзроўневых элементаў структуры, вылучаных на аснове апазіцыі. Паслядоўнасць этапаў структурнага аналізу. Метадалагічныя прынцыпы структуралізму – прымат

адносін над элементамі, сінхраніі над дыяхраніяй. Ю. Лотман і Дж. Прынс як пачынальнікі постструктуралізму і дэканструктывізму. Артыкул Ж. Дэрыды “Структура, знак і гульня ў дыскурсе гуманітарных навук”. Дэцэнтрацыя тэксту. Крытыка іерархічных апазіцый. Ідэя тэксту, цалкам пазбаўленага кантэксту. *Семіётыка.* Узнікненне навукі пра знакі і знакавыя сістэмы. Размежаванні элементаў структуры па сінхраніі і дыяхраніі, па парадыгматыцы і сінтагматыцы (Пражскі лінгвістычны гурток). Мова як спецыфічны прадмет даследавання. Ідэя інфармацыйнасці знакаў у розных кантэкстах: натуральнай мовы, штучных моў (зносіны “чалавек – машына”), метамовы (мова навук), другаснай мовы (мова культуры). Знак як мінімальная адзінка тэксту. Мастацкі твор як метазнак. Тэкст як сістэма знакаў (кадзіраванне інфармацыі) і сістэма пазазнакавых утварэнняў (мастацкіх вобразаў). Функцыянаванне знакаў і іх тыпалогія.

